Я з э п  П У Ш Ч А (Язэп Паўлавіч Плашчынскі)

## КАРОТКАЯ АЎТАБІЯГРАФІЯ

Нарадзіўся 7 мая (ст. ст.) 1902 года ў вёсцы Каралішчавічы, Мінскага раёна, у сялянскай сям'і. Бацькі былі непісьменнымі людзьмі, і не ўсіх сваіх старшых дзяцей вучылі нават у вясковай пачатковай школе. У бацькоў быў я пятым сынам, і калі мне споўнілася восем гадоў, то я пайшоў вучыцца ў Каралішчаўскае народнае вучылішча, якое праз тры гады і скончыў. Рана, з дзіцячых гадоў, стаў пастушком, узыход сонца часта сустракаў на выгане разам з каровамі ; я слухаў у полі і чуў, як раніца рыкае. Гэты вобраз пазней увайшоў у маю паэзію. Я рана навучыўся араць і касіць, і ў дванаццаць гадоў у касьбе амаль не адставаў ад дарослых, хоць фізычна і не быў моцным хлапчуком, але да касьбы здатным. З аднагодкамі сваімі і са старэйшымі любіў ездзіць на начлег. Асабліва ў часе жніва захаплялі мяне мелодыі жніўных песень , якія , здавалася, коцяцца і коцяцца з шумам спелых жытніх каласоў у чыстыя блакітныя далі. Нездарма ж гэта матывы маёй ранняй лірыкі.

Жнівень 1914 года. Пачалася першая сусветная вайна. Не забыўся да гэтага часу, як бацькі сыноў, дзеці бацькоў, жонкі мужоў, сёстры братоў , галосячы, праводзілі на вайну, як па Чэрвенскаму гасцінцу на Мінск цягнуліся бясконцыя абозы з мабілізаванымі людзьмі на вайну. Пачынаў адчуваць ~~ядкукаіцк~~ душой народнае гора, што несла з сабою вайна.

Маё навучанне ў школе спыняецца. Але калі адышла восень і я кончыў пасвіць кароў, то вырашыў рыхтавацца да паступлення ў другі клас вышэйшага пачатковага вучылішча ў Мінск. Надышоў жнівень 1915 года, я паспяхова здаў экзамены, і мяне залічылі вучнем другога класа Мінскага вышэйшага пачатковага вучылішча. Аднак заняткі не пачаліся,

бо наша армія адступала на ўсход,і Мінск рыхтаваўся да эвакуацыі. У гэты час з бровара ў Лошыцы ў Свіслач спусцілі спірт ,спілася рыба,і п'яную яе лавілі чым папала,нават бралі і рукамі.У верасні-кастрычніку запаланены былі ўсе шляхі-дарогі бежанцамі.Палякі,літоўцы,беларусы ўцякалі на ўсход,і смерць бязлітасна касіла іх,раўлі гурты галоднай жывёлы.Зімой у вёску на пастой прыгналі знясіленых салдат з фронта.Усё гэта рабіла на мяне цяжкое ўражанне.

У гэты навучальны год заняткі ў школе пачаліся толькі з новага года,а ў наступным годзе з першага верасня.Я ў Мінску.Мінск-прыфрантавы горад,на вуліцах процьма афіцэраў.Днём часамі рабілі налёты адзіночныя нямецкія самалёты,а ў ночы не-не ды і прыляціць цэпялін. У гэту восень на бышай Захараўскай вуліцы,а цяпер гэта-праспект імя Сталіна [Леніна],я сустракаў вельмі прыгожую дзяўчынку,якая прадавала асеннія кветкі,больш за ўсё астры.Вобраз гэтай дзяўчынкі-прыгажуні я назаўсёды захаваў у душы і памяці сваёй.Я пра гэта кажу таму,што пазней яно паслужыла матар'ялам да напісанне паэмы "Песня вайны",у якой незнаёмую мне дзяўчынку ўвасобіў я ў вобразе Марыі,надаўшы гэтаму вобразу сімвалічны сэнс.

Калі вучыўся ў Мінску ,адбыліся дзве рэвалюцыі:Лютаўская і Кастрычніцкая.Я дакладна тады ў рэвалюцыйных падзеях не разбіраўся яшчэ,але ўсё ж адчуваў,што прышло ў жыццё вялікае сацыяльнае і нацыянальнае абуджэнне.

1918 год,нахлынула на Мінск і пакацілася далей,на ўсход, па беларускай зямлі нямецкая акупацыя.Я ў гэты час ужо больш-менш разумеў,што нясуць з сабой акупанты на беларускую зямлю.Да акупантаў я быў настроен варожа. Пазней гэты настрой знайшоў сваё ўвасабленне ў паэме "Цень консула".У гэтым годзе я прачытаў першую беларускую кніжку.Гэтай кніжкай быў зборнік вершаў Янкі Купалы "Шляхам жыцця".Купалаўскае слова абудзіла ў мяне нацыянальную свядомасць.

У гэтым годзе я скончыў Мінскае вышэйшае пачатковае вучылішча і паступіў у пяты клас Мінскага рэальнага вучылішча. Гэта ўжо было не старое, а новае рэальнае вучылішча, у якое прымалі і рабочых і сялянскіх дзяцей.

1920 год, белапалякі растрэльваюць партызанаў, але ў сэрцы жыве надзея на вызваленне. У маі месяцы гэтага года ў сваёй вёсцы пазнаёміўся з Міхасём Чаротам. Скончыў рэальнае вучылішча, атрымаў xxxxx атастат сталасці і вярнуўся дахаты. Як толькі Чырвоная армія прынесла вызваленне, я пішу заяву ў Чэрвенскі павятовы аддзел народнае асветы, каб мяне назначылі настаўнікам. У жніўні атрымаў загад аб прызначэнні настаўнікам у Караліпчаўскую школу. Запісалася аж 80 вучняў, а я адзін настаўнік на ўсю школу. Вучняў набралася на пяць класаў, арганізаваў двухзменныя заняткі: да абеда тры класы, а з абеда два класы. Навучальных праграм, планаў не было, з аддзелу народнае асветы школу ніхто не наведваў, і я сваім адумам праз два-тры месяцы пачаў выкладанне на беларускай мове ды яшчэ ўвеў нямецкую і французскую мовы, бо я, толькі што скончыўшы рэальнае вучылішча, больш-менш ведаў іх.

У 1921 годзе ў жніўні месяцы прыйшла адносіна ў Пяржырскі валасны аддзел народнае асветы, каб камандыравалі настаўніка ў Мінск на курсы беларусазнаўства пры Наркамасветы. З настаўнікаў ахвотнікаў на гэтыя курсы, акрамя мяне, не было. Я ў Мінску на дзевяцімесячных курсах беларусазнаўства. Па літаратуры не толькі чыталі лекцыі выкладчыкі, але прыходзілі самі пісьменнікі і чыталі свае творы. Я тут, стаіўшы xxxxx подых, слухаў Янку Купалу, Якуба Коласа і Змітрака Бядулю. Пробую пісаць вершы.

У красавіку 1922 года адбыўся выпуск курсантаў першых курсаў беларусазнаўства, мне Наркамасветы прысвоіў званне лектара. Еду на працу ў Мазырскі аддзел народнае асветы ў якасці інструктара беларускай культуры. У гэтым жа годзе першыя мае вершы былі надрукаваны ў часопісу "Адраджэнне" пад псеўданімам Лясун. У верасні вяртаюся ў Мінск,

 

працую інспектарам школ Мінскага павету.

У 1923 годзе бліжэй пазнаёміўся з тагочаснымі маладымі беларускімі паэтамі: М.Чаротам, А. Александровічам, А. Вольным ,А Дударом, з празаікам і крытыкам А. Бабарэкам, і ствараем літаратурнае аб'яднанне "Маладняк".

1924 год. Настаўнічаю і працую ў „Маладняку", пачынаю больш пісаць вершаў. Шаную і люблю паэзію Я.Купалы, Я. Коласа, знаходжуся пад моцным уздзеяннем вобразнасці народнай паэзіі, захапляюся С. Есеніным. Шукаю [illegible] ку новую і светлую сцежку ў паэзію. Шырока карыстаюся вобразам, смелай метафарай, імкнуся надаць новае гучанне рыфме.

У 1925 годзе „Маладняк" наладзіў выданне маладняко ўскай бібліятэкі, у якой і выходзіць мой першы невялічкі зборнік вершаў "Раніца рыкае". Рэдагую да выданняў ў гэтай бібліятэчцы зборнікі маладых паэтаў-маладняко ўцаў. Выступаю на маладняко ўскіх літаратурных вечарах у Мінску і ў іншых гарадах рэспублікі. Увосень гэтага году адбыўся Першы ўсебеларускі з'езд „Маладняка", у якім і я прымаў удзел. Вучуся ў Беларускім дзяржаўным універсытэце.

У 1926 годзе выдаю другі свой невялічкі зборнік лірыкі "Vita". З „Маладняка" пераходжу на работу сакратаром літаратурнай камісіі Інбелкульта, у якой разам з навуковым супрацоўнікам камісіі Мачульскім пад кіраўніцтвам старшыні камісіі прафесара І. І. Замоціна рыхтаваў першае акадэмічнае выданне твораў М. Багдановіча. Увосень на акадэмічнай канферэнцыі па беларускаму правапісу пазнаёміўся з Янам Райнісам і разам з З. Бядулем знаёміў латвійскага паэта з Мінскам.

У 1927 годзе выходзіць з друку трэці зборнік лірыкі "Дні вясны". У маі месяцы гэтага году адбыўся ,так званы, "раскол" Маладняка. К. Крапіва, К.Чорны, У.Дубоўка, А. Бабарэка і я вышлі з яго і стварылі новае літаратурнае аб'яднанне Узвышша. Да нас з старэйшых пісьменнікаў далучыўся З. Бядуля, а з маладзейшых-П. Глебка і М. Лужанін. Пачынаем выдаваць часопіс "Узвышша". Увосень бяру перавод з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Ленінградскі дзяржаўны ўніверсітэт. Ленінград

здзівіў мяне ~~мяне~~ сваім хараством,сваёй строгай і велічнай архітэктурай, сваімі палацамі,помнікамі.Мне было балюча,што ў Беларусі нічога магэтага няма,і гэта навеяла песімізм,які так выразна адчуваецца ў маіх ленінградзкіх вершах,якіх я напісаў даволі шмат.Пачынаю працаваць над першай паэмай "Песня вайны",у аснову якой пакладзены ўражанні майго ранняга юнацтва.

У 1928 годзе закончыў паэму "Песня вайны" і напісаў новую "Песня акупацыі" ці ,як назваў пазней, "Цень консула".Пішу вершы і адчуваю творчае нездаваленне.

У 1929 годзе Беларускае дзяржаўнае выдавецтва выдае мой новы зборнік "Песні на руінах".Гэты зборнік не прынёс мне добразычлівых адносін з боку ~~ж~~ тагочаснай крытыкі.Шмат думаю над шляхам далейшага развіцця сваёй паэзіі,імкнуся выйсці на ~~не~~ светлую дарогу. Вяртаюся ў Мінск,працую стыльрэдактарам у Беларускім дзяржаўным выдавецтве.

1930 год.Працую над новай паэмай "Сады ветроў",якая па задуме маёй павінна была вывесці мяне на шырокія прасторы вялікай паэзіі,але ў 1930 годзе не паспеў я закончыць яе.У гэтым жа годзе напісаў паэму "Крывавы плакат",якая і выйшла з друку асобным выданнем.Гэта паэма вельмі выразна вызначыла мой ідэйны шлях: "Мужай,красуй над светам, Рэспубліка Саветаў".У гэтым жа годзе я напісаў і свой праграмны твор "Мой маніфест",які быў прыняты да друку асобным выданнем Белдзяржвыдавецтвам.У гэтым жа годзе быў здадзены ў друк вялікі зборнік лірыкі "Грэшная кніга",якая ,як і "Мой маніфест",з друку не выйшла. Рукапісаў ~~кнг~~ гэтых зборнікаў у мяне не захавалася.

З 24 ліпеня 1930 года на доўгі час перастаю друкавацца і па волі гісторыі пакідаю Беларусь на доўгія гады.

1931-1935 гг. жыву на Урале ,у Шадрынску,працую бухгалтарам і зрэдзь звяртаюся да паэзіі.

1935 -1936гг.восем месяцаў жыву ў Анапе,працую бухгалтарам у вінаградарскім саўгасе "Джэмэтэ",напісаў некалькі вершаў.

1937-1958 гг. жыву на Мурамшчыне, Уладзімірскай вобласці, працую спачатку настаўнікам, а апошнія дзевятнаццаць гадоў дырэктарам Чаадаеўскай сярэдняй школы. У часе Вялікай айчыннай вайны быў мабілізаваны і знаходзіўся ў Маскве, у 2-ім Маскоўскім пяхотным вучылішчы. У 1947г. наведаў Мінск, пабачыў руіны і пачатак будаўніцтва новага Мінска. Напісаў адпаведны верш. Жывучы ў Чаадаеве, у пяцідзесятыя гады пачынаю больш пісаць. У 1956 годзе "Полымя" надрукавала мой верш "Адаму Міцкевічу". Гэта мяне духоўна акрыліла.

І ў 1955 і ў 1956 годзе я наведваў Мінск, а 19 ліпеня 1958 года з сям'ёй зусім вярнуўся. За гэты час напісаў некалькі вершаў, казку "На бабрыцы", паэму "Людвіся" і інш.

27 верасня 1959 года. Язэп Пушча

Мінск.

14 сентября 1964 года.